УДК 654.197

У.І. Кулікові, канд. філал. навук, дац.;
В.А. Данько, студ. 4 курса
(БДТУ, Мінск)

# ІНФАТЭЙНМЕНТ ЯК МЕТАД ПАДАЧЫ ІНФАРМАЦЫІ: ПРАБЛЕМЫ ІНТЭРПРЭТАЦЫІ ТЭРМІНА

Тэрмін інфатэйнмент адносна новая лексема для беларускай медыяпрасторы і рэдакцыйна-выдавецкай дзейнасці, які з'явіўся ў нас толькі ў XXI ст. Напрыклад «Беларуска-рускі тлумачальны слоўнік новых слоў і новых значэнняў слоў» (складальнікі В.І. Уласевіч, Н.М. Даўгулевіч; Мінск: Аверсэв, 2013) не фіксуе яго.

У слоўніках англійскай мовы тэрмін замацаваўся раней – у 80-я–90-я гг. XX ст. Утворана слова шляхам абрэвіяцыі ад англійскіх «INFOrmation» (інфармацыя) и «enterTAINMENT» (забава, пацеха) – г. зн. інфармуючы, забаўляй. Паводле аналогіі: *эдутэйнмент* – спалучэнне адукацыі і забавы.

Узнікла названая з'ява з мэтай спрасціць дыялог з глядацкай і чытацкай аўдыторыямі, зрабіць журналісцкі тэкст актуальным, цікавым і даступным для ўспрыняцця і асэнсавання.

Паводле прызнання даследчыкаў, адзінага разумення сутнасці тэрміна і адназначнага стаўлення да названага ім феномену па сёння не сфарміравалася. Гэта звязана з неадназначным стаўленнем да самой з'явы, якая першапачаткова ўспрымалася як негатыўная, разбуральная што вядзе да падзення адукаванасці гледачоў (слухачоў, чытачоў). На сучасным этапе існуе іншая думка: інфатэйнмент – гэта найперш форма, у якую увасабляецца інфармацыя, з мэтай аблегчыць разуменне пачутага (пабачанага) для максімальна вялікай колькасці адрасатаў.

У найшоўшых беларускамоўных крыніцах інфатэйнментам называюць «спосаб падачы тэлевізійнага матэрыялу, які прадугледжвае спалучэнне / сінтэз атрымання інфармацыі (навін) і правядзення вольнага часу» [1, с. 327]; актуальнага матэрыялу, які адначасова прапануе спажыўцу інфармацыю і забаўляе яго [2, 327]. У журналісцкіх рэпартажах наступным чынам характарызуюць гэты феномен: «Тэлебачанне інфармацыйнае ўжо даўно перайшло на так званы інфатэйнмент, калі галоўнае – і што, і як: прыгожыя студыі, сучасная графіка і яркая карцінка. За кошт гэтых інструментаў атрымліваецца «адыграць» адставанне ў аператыўнасці ў інтэрнэт-выданняў» (У Мінску адкрыўся XIII Міжнародны медыяфорум (tvr.by).

У замежных крыніцах, паводле вынікаў аналізу існаваных поглядаў, праведзеных Д.А. Яромінай, інфатэйнмент – гэта: 1) не

проста спосаб адлюстравання рэчаіснасці, а адлюстраванне пэўнага светапогляду праз мас-медыя (Н. Постман); 2) змешванне стылёвых асаблівасцей (мантаж, дызайн студыі), тыповых для трансляцыі інфармацыйнага і забаўляльнага зместу; 3) усе магчымасці забаўляльнага афармлення інфармацыі: выбар тэматыкі, візуальныя і вербальныя метады (А. Віттвен); 4) імкненне прадзюсараў падаваць навіны ў форме забаўляльных перадач або з адценнем забаўляльнасці (Л.М. Землянава); 5) асобы спосаб або журналісцкі прыём для перадачы інфармацыі, дзе журналіст знаходзіць і падае ў матэрыялах на любыя, у першую чаргу «сур'ёзныя» тэмы, займальныя дэталі і сюжэты (Б. Лазоўскі) [3].

Асноўнымі атрыбутыўнымі характарыстыкамі інфатэйнмента ў эпоху, калі ўладарыць усеагульнае змешванне і «насмешлівасць» з усяго, назіраецца адмаўленне ад ісціны, замест гісторыі, калі змест не адлюстроўвае рэальнасць, а стварае новую, нават мноства рэальнасцей, іншы раз супрацьлеглых, сучасныя даследчыкі называюць наступныя: інфарматыўнасць, забаўляльнасць, перавага формы над зместам, эмацыйнасць, поліфункцыянальнасць і поліжанравасць, камерцыйная арыентацыя на рэйтынгі, візуальная прыцягальнасць, фрагментарнасць і ўніверсальнасць [4, с. 175].

Такім чынам, можна сцвярджаць, што інфатэйнмент – складаная, неадназначная з'ява, феномен якой застаецца не да канца вывучаным даследчыкамі журналістыкі. І абсалютна не даследаваным з пункту погляду выдавецкай практыкі. У тэорыі журналістыкі інфатэйнмент разглядаецца і як фармат, і як жанр, і як метад падачы інфармацыі. Аўтары медыятэксту не толькі забаўляюць аўдыторыю, але і знаёмяць яе з важнымі вострасацыяльнымі пытаннямі. «Тым не менш, ні для каго не сакрэт, – адзначаюць Н.А. Захарчанка і Т.В. Карэлава, – што інфатэйнмент бывае дыструктыўным, часта на расійскім тэлебачанні яго выкарыстоўваюць для стварэння фэйкавых навін, для фарміравання карціны свету, якая не заўсёды супадае з рэальнасцю. Вывучэнне прыёмаў інфатэйнменту, пазнаванне маніпулятыўнай прыроды тэлебачання – адна з неабходных умоў сучаснай медыяадукацыі» [5, с. 4].

ЛІТАРАТУРА

1. Медыяадукацыя ў школе: фарміраванне медыяграматнасці вучняў: дапаможнік для настаўнікаў / М.І. Запрудскі, А.А.Палейка, А.У. Радзевіч, Т.П. Мацкевіч і інш.; пад рэд. М.І. Запрудскага. – Мінск: Юстинус, 2016 – 334 с.

2. Кузьмінава, А. Ю. Маладзёжная тэлеаўдыторыя ў кантэксце дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі Рэспублікі Беларусь : дапаможнік / А. Ю. Кузьмінава ; пад агул. рэд. В. М. Самусевіч. – Мінск : БДУ, 2018 – 335 с.
3. Ерёмина Д.А. Интерпретация термина «инфотейнмент» в немецких и российских исследованиях масс-медиа // Электронный научный журнал «Медиаскоп», 2013, №4. Режим доступа: http://www.mediascope.ru/node/1429. Дата доступа: 06.01.2022
4. Драгун, Е. М. Инфотейнмент как явление современной медиакультуры: дисс. … канд. филос. наук. М., 2015. 185 с.
5. Захарченко Н. А. Инфотейнмент в современных массмедиа: учебное пособие / Н.А. Захарченко, Т.В. Карелова. – Самара: Издательство Самарского университета, 2020. – 88 с.

УДК 655.533(02.053.2)

Д.П. Зылевич, канд. филол. наук, доц.
(БГТУ, г. Минск)

## ПОПУЛЯРНЫЕ ТЕХНИКИ ИЛЛЮСТРИРОВАНИЯ В КНИЖНЫХ ИЗДАНИЯХ ДЛЯ ДЕТЕЙ

Детская иллюстрированная книга активно развивается. Белорусские издательства радуют читателей яркими, современными, качественными книгами. В разные исторические периоды у художников были свои предпочтения в области техник иллюстрирования. Каждое время рождает свои тренды, затем они уходят, приходят новые под влиянием литературы, кинематографа, других видов искусства и компьютерных технологий [1]. Объект нашего исследования – книги, выпущенные белорусскими издательствами в 2016–2021 гг. Цель – охарактеризовать наиболее популярные техники иллюстрирования в современных изданиях для детей дошкольного и младшего школьного возраста.

Акварель – техника, которая позволяет достичь легкости, полупрозрачности, атмосферности. Здесь нет контрастов, зато есть мягкие переходы и полутона. В этой технике активно работают Павел Татарников, Екатерина Михалицына, Екатерина Бабок. Техника акварели хорошо сочетается с другими техниками и материалами (карандаши, тушь), она особенно популярна при создании коллажей.

Тушь – очень гибкая техника. Инструментами выступают кисть, перо, палочки и др. Тушь позволяет создать плотные мазки, густые контурные линии и хорошо сочетается с другими техниками. Наибо-